Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 43 (57) Пятніца, 14 верасня 1945 г.

## НАЦЫЯНАЛЬНАМУ СВЯТУ— ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ

17 верасня спаўняецца шостая гадавіна ўз'яднання беларускага народа ў адзіную совецкую дзяржаву. Лічаныя дні аддзеляюць нас ад гэтай знаменальнай даты.

Дзень 17 верасня ўвайшоў у гісторыю, як найвялікшае нацыянальнае свята ўсяго беларускага народа. У 1939 годзе вялікі рускі народ і ўсе народы Совецкага Саюза падалі руку брацкай дапамогі і вызвалілі працоўных Заходняй Беларусі з-пад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Тады беларускі народ уз'яднаўся ў адзінай совецкай дзяржаве.

Гадавіна ўз'еднання беларускага народа асабліва вялічава ў гэтым годзе. Гераічная Чырвоная Армія атрымала гістарычную перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі і японскім імперыялізмам. У ходзе Айчыннай вайны ўз'яднаны беларускі народ яшчэ больш згуртаваўся вакол большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна. Цяпер, не шкадуючы сіл, ён змагаецца за аднаўленне разбуранай ворагам гаспадаркі. На палях, фабрыках і заводах кіпіць творчая праца народа-пераможцы.

Асабліва высокі вытворчы і палітычны ўздым назіраецца ў перадсвяточныя дні. Падрыхтаваць дастойны падарак нацыянальнаму святу—жаданне ўсіх працоўных. Па прыкладу дамачэўцаў ва ўсіх вёсках нашага раёна разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва— да 17 верасня поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па збожжапастаўках, за праведзенне азімай сяўбы ў 20 рабочых дзён.

Соцыялістычнае спаборніцтва дае свае вынікі. З кожным днём прыбаўляецца лік вёсак, якія поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках. Першынства ў соцыялістычным спаборніцтве трымаюць Акцябрскі, Дзеткавіцкі сельсоветы. Тут хлебапастаўкі выкананы на 70—72 проценты.

Аднак, ёсць сельсоветы, як Дзераўноўскі, Каменскі і другія, якія працягваюць ганебна адставаць, не выконваюць графіка хлебапаставак. Кіраўнікі гэтых сельсоветаў справу выкананія збожжанарыхтовак пусцілі на самацёк. Тут не арганізавана соцыялістычнае спаборніцтва, за датэрміновую здачу збожжа дзяржаве, не растлумачваецца сялянам аб перадавіках па здачы хлеба, адсутнічае масава-палітычная работа.

Да вялікага свята засталіся лічаныя дні. Абавязак партыйных і совецкіх работнікаў узначаліць соцыялістычнае спаборніцтва ў вёсцы за датэрміновае выкананне хлебанарыхтовак, за дастойную сустрэчу вялікага нацыянальнага свята— 17 верасня.

Сяляне і сялянкі! Датэрмінова выканаем свой абавязак перад Радзімай—здачу збожжа. Дастойна сустрэнем сваё светлае свята!

### 22, 5 ТОНЫ ХЛЕБА Ў ФОНД ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Прыбліжаючыя дні к вялікому святу 17 верасня сяляне Акцябрскага сельсовета азнаменоўваюць масавай здачай збожжа дзяржаве.

На 13 верасня з сельсовета на прыёмачны пункт, апрача зданага збожжа дзяржаве, паступіла ў фонд Чырвонай Арміі 22,5 тоны хлеба.

## Сход партыйнай арганізацыі

11 верасня адбыўся раённы партыйны сход.

З дакладам аб ходзе выканання хлебанарыхтовак выступіў першы сакратар райкама КП(б)Б тав. Яроцкі. Дакладчык адзначыў, што партыйная арганізацыя раёна не выканала рашэння абкома КП(б) Б аб здачы збожжа дзяржаве да 1 верасня 1945 года. План збожжанарыхтовак па раёну на 10-верасня выканан усяго на 17,3 працантаў.

Комуністы—упаўнаважаныя райкома партыі ў сельсоветах работалі дрэнна, не мабілізавалі насельніцтва на выкананне хлебанарыхтовак.

Выступаючыя ў спрэчках комуністы падвергli рэзкай крытыцы работу асобных упаўнаважаных. Тав. Козцікаў адзначыў, што ўпаўнаважаныя па Каменскаму сельсовету—комуністы райваенкамата, па Аніскавіцкаму—НКВД, па Галоўчыцкаму—Шлеймовіч, Зайцава работалі недастатковa, у выніку чаго па гэтых сельсоветах ідзе марудна выкананне хлебанарыхтовак дзяржаве.

Усяго ў спрэчках выступіла 12 чалавек.

Раённы партыйны сход прыняў рашэнне, мабілізуючае комуністаў на выкананне хлебанарыхтовак у бліжэйшыя дні.

### НАСУСТРАЧ 17 ВЕРАСНЯ

Да 17 верасня—дня уз'еднання беларускага народа ў адзіную дзяржаву поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па збожжапастаўках—вось імкненне сялян Галоўчыцкага сельсовета. На 14 верасня па сельсовету здана дзяржаве 46,5 тон збожжа.

Селянін вёскі Галоўчыцы Грыгорый Новік, здаўшы дзяржаве 271 кілограм замест плана 90 кг., заявіў:

—Совецкая ўлада вызваліла нас ад польскіх памешчыкаў, дала нам зямлю. Зараз мы вырасцілі багаты ураджай і дадзім краіне столькі хлеба, каб яна была яшчэ больш магутнейшай.

В. Самовіч.

## ЗВОДКА

**аб ходзе збожжанаставак дзяржаве і ў фонд Чырвонай Арміі па раёну на 12 верасня.**

| №№ п/п | Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|---|
| 1 | Акцябрскі | 72,5 |
| 2 | Дзеткавіцкі | 70,1 |
| 3 | Худлінскі | 51,9 |
| 4 | Антопальскі | 51,6 |
| 5 | Ілаўскі | 47,2 |
| 6 | Дзямідавіцкі | 46,2 |
| 7 | Першамайскі | 45,3 |
| 8 | Асіпавіцкі | 44,1 |
| 9 | Галоўчыцкі | 43,7 |
| 10 | Аніскавіцкі | 40,6 |
| 11 | Гарадзецкі | 39,8 |
| 12 | Заніўеўскі | 38,9 |
| 13 | Каменскі | 35,4 |
| 14 | Дзераўноўскі | 34,6 |

Па раёну: 49,1

### ПЕРШЫМ У РАЁНЕ

Дастойную сустрэчу рыхтуюць гадавіне ўз'еднання беларускага народа ў адзіную дзяржаву сяляне раённага цэнтра.

На 10 верасня першым у раёне Антопальскі горсовет выканаў план сенанаставак на 100,2 процантаў.

## Страты японцаў і трафеі нашых узброеных сіл на Далёкім Усходзе за час з 9 жніўня па 9 верасня 1945 года

На Далёкім Усходзе наша армія і ваенна-марскі флот з 9 жніўня па 9 верасня гэтага года панеслі праціўніку наступныя страты ў жывой сіле і тэхніцы

**Захоплена:** самалётаў—925, танкаў—369, бронемашын—35, палявых гармат, у тым ліку і самаходных—1.226, мінамётаў—1.340, кулямётаў—4.836, вінтовак—каля 300 тысяч, радыёстанцый—133, аўтамашын—2.300, трактараў і цягачоў—125, коней—17.497, складаў з боепрыпасамі, узбраеннем, спаражэннем і прадавольствам—742.

Нашым войскам **здалося ў палон** больш 594 тысячы японскіх салдат і афіцэраў, і 148 генералаў, у тым ліку да 20 тысяч раненых. Японцы страцілі толькі забітымі звыш 80 тысяч салдат і афіцэраў.

Такім чынам, агульныя страты японцаў у людзях, не лічачы загінуўшых камандаў з затопленых японскіх караблёў, складаюць: палоннымі і забітымі звыш 674 тысячы салдат і афіцэраў.

Караблямі часцямі Ціхаакіянскага флота за той-жа перыяд часу **патоплена** наступная колькасць караблёў і плаўсродкаў японцаў: эсмінцаў—2, транспартаў—28, танкераў—3, катэраў—5, барж і шхун—12.

За гэты-ж час страты нашых войск на Далёкім Усходзе складаюць забітымі 8.219 чалавек і раненымі—22.264 чалавекі.

**Совінформбюро.**

### 19 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ НА ДОЎГАТЭРМІНОВЫЯ КРЭДЫТЫ СЯЛЯНАМ

У 1945 годзе ўрад адпусціў на доўгатэрміновае крэдытаванне сялян заходніх абласцей рэспублікі 10 мільёнаў рублёў. Кожная бедняцка-серадняцкая гаспадарка мае магчымасць атрымаць ад дзяржавы праз раённае аддзяленне Сельскагаспадарчага банка крэдыт тэрмінам на пяць год у суме да 5-ці тысяч рублёў на аднаўленне і пабудову дамоў, гаспадарчых пабудоў, на пакупку коней, кароў, сельскагаспадарчага інвентара;

## Міжнародны агляд

Совінформбюро апублікавала даныя аб стратах японцаў, нанесеных імі за час з 9 жніўня па 9 верасня 1945 года. Узброеным сілам СССР на Далёкім Усходзе здалося ў палон больш 594 тысячы салдат і афіцэраў. Толькі забітымі праціўнік страціў звыш 80 тысяч чалавек. Узята ў палон і ўся камандная вярхушка Квантунскай арміі ў саставе 148 генералаў.

Поўная ліквідацыя Квантунскай арміі,—лепшай арміі Японіі—сведчанне таго, што капітуляцыя агрэсара з'явілася сапраўды безагаворачнай. Палітычная прапаганда японскага радыё і друку прадаўжае, праўда, цвердзіць аб „вызваленчай ролі" Японіі ў адносінах народаў Азіі і ўсяляк пазбягае нават звычайнага ўжывання слова капітуляцыя. Карэспандэнт амерыканскага агенства „Юнайтэд Прэс" піша, што „японскі народ па-ранейшаму ганарлівы і не жадае прызнаваць паражэнне". Аднак японскіх захопнікаў не выратуюць ніякія ўвёрткі.

Замежны друк настойвае зараз на адхіленні японскай ваеншчыны ад кіраўніцтва краінай, бачучы ў гэтым важнейшую прадпасылку сапраўднага раззбраення Японіі і дэмакратызацыі яе ладу.

У Францыі па меры набліжэння выбараў ва Ўстаноўчы сход узмацняецца імкненне рэакцыйных кругоў да таго, каб ёй стала захаваць старую канстытуцыю 1875 года, якая забяспечвае інтарэсы гэтых кругоў. Вынікі выбараў у муніцыпалітэты (органы мясцовага самакіраўніцтва) паказалі, што народ гатоў абараняць дэмакратычныя прынцыпы. Дэмакратычныя арганізацыі, якія маюць вялікі ўплыў у краіне, выказаліся за такую сістэму выбараў, пры якой усюды поўнаму ліку выбаршчыкаў у акрузе адпавядаў-бы роўны лік выбіраемых прадстаўнікоў ва Ўстаноўчы сход. Аднак, як паведамляе французскі друк, апублікаваны ўрадам выбарчы закон пабудаваны на іншай аснове. Так, у трэцяй выбарчай акрузе Парыжа адзін дэпутат будзе на 100 тысяч жыхароў, у дэпартаменце Ніжніх Альп—на 44 тысячы, а Бельфоры нават на 24 тысячы. Пры такой сістэме шчыльна населёныя прамысловыя раёны краіны будуць прадстаўлены ва Ўстаноўчым сходзе значна слабей, чым маланаселёныя правінцыяльныя дэпартаменты.

У сувязі з такім становішчам прадстаўнікі прафсаюзнага цэнтра краіны—Усеагульнай Канфедэрацыі працы, Лігі праў чалавека, радыкал-сацыялісцкай, сацыялістычнай і камуністычнай партый уручылі главе ўрада дэ Голлю заяву, у якой выказалі недахопы выбарчага закона. „Сход, які будзе мець велізарную частку скласці новую канстытуцыю і стварыць урад, маючы паўнамоцтвы прадстаўляць Францыю ў часе мірных перагавораў,—гаворыцца ў заяве,—павінен быць у вачох французаў, як і ў вачох дэмакратычнага света неаспрэчваемым сходам: ён можа быць такім, калі ён будзе выбран на аснове неаспрэчваемых прынцыпаў, гэта значыць пры поўным захаванні роўнасці галасуючых".

Французская рэакцыя пры выбарах заўсёды рабіла стаўку на дэпутатаў правінцыяльных акруг. Яна хоча гэтага і цяпер. 21 кастрычніка французы, галасуючы за таго або іншага кандыдата ва Ўстаноўчы сход, адначасова павінны будуць, адказваючы на пытанне рэферэндума, выказаць свае адносіны да прапанаванага ўрадам праекта арганізацыі дзяржаўнай улады, а таксама выказацца аб характары паўнамоцтва Ўстаноўчага схода.

Найбольш паслядоўныя дэмакратычныя кругі Францыі выказваюцца супроць праекта ўрада і настойваюць на даныя Ўстаноўчаму сходу поўнаўладаванага характару.

**В. Грышанін.**

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

ГЛ 14861 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Савецкая вуліца, дом № 2.